**Лера Сом**

# Каралева прыйдзе ноччу

***Вершы пра каханьне***

**Логвінаў**
**2007**

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

# Блюз Каралеўскае Кухні

Самая лепшая ў сьвеце кава –
У Каралевы.
Самая лепшая ў сьвеце кава –
Для Каралевы.
Быць прынятым на гэтай
Маленькай кухні –
Найвышэйшы гонар  і асалода…
Каралеўская кава
На бэжавай кухні,
Каралеўская кава –
Яна для абраных,
Каралеўская кава
У Каралевы.

Самыя лепшыя ў сьвеце вершы –
У Каралевы.
Самыя лепшыя ў сьвеце вершы –
Для Каралевы.
Прысьвяціць Каралеве санэт ці паэму –
Найвышэйшы гонар і асалода…
Каралеўскія вершы
На бэжавай кухні,
Каралеўскія вершы
Пад лепшую каву –
Гэта ўсё для абраных,
І перш за ўсё
Для Каралевы.

Самыя лепшыя ў сьвеце кветкі –
У Каралевы.
Самыя лепшыя ў сьвеце кветкі –

Для Каралевы.
Падарыць Каралеве барвовую ружу –
Найвышэйшы гонар і асалода...
Каралеўскія ружы
На бэжавай кухні,
Пахі ружаў мяшаюцца
З водарам кавы,
Геніяльныя вершы –
Усё для абраных,
І найпершая з гэтых абраных
Яна, Каралева.

Самы утульны на сьвеце ложак –
У Каралевы.
Самы утульны на сьвеце ложак –
Для Каралевы.
Быць прынятым на гэтым шырокім ложку –
Найвышэйшы гонар і асалода...

Толькі кожны вечар,
Як б'е дванаццаць,
Каралева зьнікае
З маленькай кухні,
А яны, абраныя, застаюцца
Сярод ружаў і вершаў
У поўным складзе.
Дапіваюць сваю
Цудоўную каву,
І ідуць дамоў,
Па сваіх кватэрах,
І ніхто зь іх ня будзе
Ахоўваць сон
Каралевы.

Каралеўская кава –
Найлепшая ў сьвеце,
Каралеўская кухня
У бэжавых фарбах,
Каралеўскія кветкі,
Чароўныя вершы –
Гэта ўсё, чым вам можа аддзячыць
Яна, Каралева.

KAMUNIKAT.org

*  *  *

…Каралева прыйдзе ноччу,
Зоркай жнівеньскага неба
Ціха скоціцца ў далоні…
Усьміхнецца: -- Ну, пакрочым,
І відовішчаў, і хлеба
Ты наеўся… Пераломім,

Адвядзем наканаваньне,
Перакрэсьлім ніткі лёсу,
Тканьне Паркаў перайначым.
Мне ў дарогу на сьвітаньні…
Заўтра мы пабачым восень,
Толькі як яе пабачым?

Я – Абраная, ты сёньня
Мной абраны… Як стрываеш,
Як зьнясеш сваё абраньне?
Вось я – зорка на далоні,
І пякуся трошкі… Маеш
Сілы на суіснаваньне?..

Што адкажаш, мілы дружа?
Вочы ў вочы не нахлусіш,
Толькі ж не адвесьці вочы…
Вецер. Дождж. Дарога. Лужы.
Ты адказ шукаеш, мусіш:
Каралева прыйдзе ноччу.

# Каралева лётае ў сьне

Каралева лётае ў сьне,
У яе два белых крыла…
Твая дачка невідушчая ёй
Усьлед вочы свае ўзьняла.

Я стаміўся рэбры крышыць,
Ды няхай навокал крыжы,
Каралева загадвае лепшым жыць
На апошняй сваёй мяжы.

Каралеўскі двор
Месца сноў і мар.
Каралеўскіх зор
Не прадасьць зьвяздар.
Каралеве сьніць
Сонечныя сны.
Каралеве быць
Сонцам да вясны
Твайго абуджэньня…

Каралева будзе сьпяваць,
Каралева будзе ісьці…
Твае адзінокія сьненьні – ёй,
І лепшых тут не знайсьці.

Каралеве – першая кроў,
Каралеве – годных спачын...
Нават горкі пах каралеўскіх звяроў
Будзе цябе лячыць.

Каралеўскі двор

kamunikat.org

Месца сноў і мар.
Каралеўскіх зор
Не прадасьць зьвяздар.
Каралеве сьніць
Сонечныя сны.
Каралеве быць
Сонцам да вясны
Твайго абуджэньня…

Каралеве напрыканцы
Падліюць атруты ў віно.
Ніхто ня будзе ёй верны апроч
Адзіноты яе адной.

Пазаве на апошні бой –
Сонных прывідаў не зьлічыць.
Каралева будзе сама сабой –
Адзінотай тваёй душы…

Каралеўскі двор
Месца сноў і мар.
Каралеўскіх зор
Не прадасьць зьвяздар.
Каралеве сьніць
Сонечныя сны.
Каралеве быць
Сонцам да вясны
Твайго абуджэньня…

* * *

Ты прыедзеш у дождж, мы сустрэнемся пад
парасонам…
Мокры брук, я лячу, ты хапаеш мяне за рукаў…
Брудны помнік у сквэры праводзіць нас
позіркам сонным,
Чорным срэбрам паблізу праблісьне старая рака.

Я цябе напаю, хочаш – кавай, а хочаш –
гарбатай,
У акне пасьміхаецца поўня праз дождж і праз
змрок.
Зноў табе прасьпяваю пра тыя журботы і страты,
Ад якіх ты мяне ні тады, ні цяпер не зьбярог.

“Нешта робіцца з часам і зь людам, змарнелі
дарэшты,
Засталіся у цьмяных стагодзьдзях мае
песьняры…”
… Я пайшла б за табой, сябра мой, малады і
стары,
Я пайшла б за табой, ды ня ведаю, ці пазавеш
ты.

*   *   *

Ёсьць ты і я, два сьветы, дзьве душы,
Два розныя і родныя стварэньні.
І разам нам ня быць, як ні пішы
Ты кнігу лёсу; не скрануць каменьні.

А нам з табой так хочацца ўявіць,
Што мы з табой ня бачыцца ня зможам…
Але струна нябачная зьвініць:
Ёсьць небакрай і ёсьць звычайны ложак.

І ты ня бачыш розьніцы ўначы,
А для мяне яна даўно істотна,
І ад сябе самое не ўцячы,
А толькі разьвітацца незваротна.

Магчыма, родны мой, усё прасьцей,
Ды зьвязвацца са мной табе ня раю:
Неразуменьне будзе найчасьцей,
Бо я хачу дайсьці да небакраю.

* * *

Зноў поўнач за акном…
Начная праца – сродак
Забыць, што так дарма
пражыты цэлы дзень…
Званок, вось ты, з табой –
чужой дарогі водар,
І разам зь ім адчай
нязьдзейсьненых надзей.

Твае шляхі ідуць,
дзе мне ня быць давеку,
Ды я ўжо й не хачу
тых зданяў даганяць,
Што абяцалі сьвет
каханьня і бясьпеку,
І тыя гарады,
якія толькі сьняць.

Час вернецца назад,
хутчэй заплюшчы вочы!..
Ды хтось мне падарыў
упэўненасьць у тым,
Што у мяне ёсьць шлях,
якім мне трэба крочыць,
І мне ісьці адной,
зусім адной па ім.

І твой начны прыезд –
маё выпрабаваньне,
Спакусьлівы адказ
малітвам іншых дзён…

Вандроўнік, сьпі, я ўсё
дарую на сьвітаньні,
І жывіць хай цябе
спакойны гэты сон.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Я буду вітацца зь некім,
Хто прыйдзе ў гадзіну ночы.
Ты будзеш паіць гарбатай
Жанчыну ў ружовай сукні.
Пасьля захачу заплакаць,
Ды сьцісну па звычцы зубы,
А ты адхінеш фіранкі
І з сумам зірнеш уніз...

І мы раніцой ня ўспомнім,
Чаму нам было так дрэнна,
Калі асьцярожны ветах
Па бездані неба плыў...

Я буду вітацца зь некім...
Ты будзеш паіць гарбатай...
І мы не ўзгадаем болей,
А што там у нас было.

KAMUNIKAT.org

*  *  *

Маркотны мой вершнік,
Навошта цябе пасылала
За славай?
Мой першы,
Вяртайся дамоў да сутоння,
Прадонне чакання
Ёсць бездань адчаю…
Вяртайся!.. Страчаю…
Вяртайся… Пачую –
Маўчу я.

KAMUNIKAT.org

* * *

Пасярод сну
Ты
Узнікаеш,
Прамейшы за клічнік,
Але таямніцай
Будзе нават твой цень,
Ці, дакладней, адсутнасць яго.

Мір паміж намі.
Падзелены землі і людзі,
Збройнік не вострыць мячы.

Смерць паміж намі.
На курганах
Паўсталі памежныя знакі.

Час паміж намі...
Дык што
Гоніць цябе ў мае сны?

KAMUNIKAT.org

# Купальская песенька

Гэты хлопчык, ён будзе маім,
І да самага ранку…
Пакуль сьпяць груганы,
Пакуль крочыць узьнёслы вандроўнік.
Пакуль сто кажаноў
Так нястомна вартуюць паляну,
Дзе апоўначы полымем жудасьці
Выбухне кветка.

Гэты хлопчык, ён будзе маім
Да апошняй хвіліны
Неспакойнага сну ведуна
І малітвы манаха…
Да мінорнае ноты
Празрыстай бязьлітаснай песьні,
Што сьпявае рака,
У віры запрашаючы скочыць.

… Гэты сьвет падуладны мне змалку,
Ды пэўныя межы
Ёсьць у кожнага з нас,
Бы законы прасторы і часу…
Чуеш, ціха сьмяецца русалка
Зь зялёнай затокі:
-- Гэты хлопчык… Ён будзе з табой,
Пакуль ты не кахаеш.

* * *

Даўгакосая Панна! Калі б я толькі ведаў,
Што чакаеш мяне да апошняе зоркі…
Я прыеду – ты чуеш? – аднойчы прыеду,
Грукну ў дзьверы на золку.

Даўгакосая Панна! Калі б я толькі верыў,
Што ты помніш мяне безь ніякай надзеі...
Я прыеду. Аддзячыш мне мерай за меру –
За бязьдзейнасьць і дзеі.

Даўгакосая Панна! Я ня мог памыліцца –
Ты чакаеш, і помніш, і бачыш, як будзе:
Я прыеду, пакінуўшы іншым сталіцы...
Ранак, вецер і студзень...

Даўгакосая Панна! Я ўзмацнелы і сталы,
Што стаім на парозе-памежжы?
Я прыехаў!..Спазьніўся на месяц... Ты стала
Сьнежнай Паннай у сьнежні.

*   *   *

З табой на высьпе, дзе няма нікога,
Я апынуся неяк выпадкова,
І мы падзелім выспу напалам,
І кожны здагадаецца навошта,
Калі я прыгадаю два радкі,
Агучаныя некім з дылетантаў:
“Вам разам быць ня дадзена ніколі,
Пакуль сьвет гэты існуе наогул…”

І мы даўно згадзіліся з прароцтвам,
І нават тут, на гэтай дзікай высьпе,
Дзе прыкрых назіральнікаў няма,
Жыве, квітнее, цешыцца мяжа…

Мы звыкліся, мы згодныя, мы самі
Яе штодзённа пільна паднаўляем,
Вядзем прыстойна доўгія размовы,
І кожны ходзіць на сваім баку…

Ды толькі я прысьніла сон учора –
Што пра мяжу забыў ты і прыйшоў,
І я забыла, і цябе сустрэла
Абдымкамі, і нашых пацалункаў
Было бязь ліку. І ці сон быў гэта?

* * *

Усё, што я магу
Падарыць табе –
Гэта месца ў Вечнасьці.
Тваё ж пры табе застанецца,
І цалкам:
Мне хопіць сваёй моцы,
Мне хопіць сваёй свабоды.
Але…
Я
Магу
Падарыць табе
Месца ў Вечнасьці.
Толькі падумай як сьлед –
Ці здолееш ты прыняць
Мой падарунак?..

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Ты выключаеш сьвятло,
Каб ня бачыць мой сьмех.
Ты распранаеш мяне,
Каб ня зьведаць душы.
Чорная птушка ў руцэ,
Чорная птушка ў вачах...
Ты так баішся крыла
Адзіноты маёй.

Днём ты бяжыш у натоўп,
Каб кагосьці шукаць.
Што ты там можаш знайсьці,
Не знайшоўшы сябе?
Я зачыняю замкі,
І мая адзінота са мной.
Толькі пад гэтым крылом
Да свабоды ўзьлячу.

Вечарам зноўку ідзеш
Да знаёмых дзьвярэй.
Самае дзіўнае, што
Я табе адчыню.
Толькі затым,
Каб упэўніць сябе яшчэ раз:
Самае лепшае –
Быць у кватэры адной.

*   *   *

Забойства каханых – заўсёдная справа,
І як ні круціся налева, направа,
Яно непазьбежнае. Гэта хвіліна
Прарыву на волю.
А воля падорыць пятлёю і змрокам,
Яна – адзінота з абвостраным зрокам,
І вартая ў сьвеце вар'яцтва адзінай,
Асобнае ролі –

Забойцы каханых. І іншага выйсьця,
На жаль, не было і ня будзе. Калісьці
Лічылі іначай… Ды толькі лічылі
Ня тыя, ня тое…
Прабач, не кахаю. Захоўваю рукі
Ад чорнай крыві, ад лязовай навукі,
Мяне віжаваць ды служыць не вучылі
Ні ў суш, ні слатою,

Ні іншым надвор'ем. Мае віншаваньні
Штодзённай свабодзе ў свабодным каханьні!
Прабач, не люблю аднаразавых рэчаў:
Яны для галечы.

А вольным зь пятлёй, адзінотай і змрокам
Ісьці да абранасьці ўпэўненым крокам…
Палай мяне, сябра, -- нішто не бясспрэчна.
Прабач. Да сустрэчы.

* * *

Трымаць цябе за руку –
І, можа, нічога болей.
Трымаць цябе за руку,
Завулкам ісьці туды,
Дадому, дзе будзе кава.

Пусты і брудны цягнік
Адцягнуць з першага шляху.
Пусты і брудны цягнік
Да раніцы ціха сьпіць.
А мы – мы нап’емся кавы.

Прусак дасьледуе столь –
Лянота скакаць на зэдлік.
Прусак дасьледуе столь,
А мы – адносіны сноў
Да раніцы і да кавы.

І мы – начныя зьвяры,
І ў зрэнках у нас – па зорцы.
І мы, начныя зьвяры,
Занадта любім сябе,
Сваю адзіноту разам,
Паўночны шпацыр – і каву.

* * *

Марозік і крышку сонца…
Натоўпы ў задушных крамах…
Ідзе мітусьня і гандаль
Усім, што табе ня трэба.
Знаёміцца лепей ноччу
І з горадам, і са мной.

Тады маладзік ці поўня
Цябе павядуць шляхамі
Кручастых сівых завулкаў,
Дзе лішніх людзей ня будзе,
А толькі прастора часу,
І час зразумець прастору,
І ўсе вымярэньні месца,
Дзе можна знайсьці сябе.

…Тут вецер упарта носіць
І ранкам, і днём, і ноччу
Па вулках, плошчах і дахах,
Па хісткіх пустых хацінах
Мянушку-імя маё.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Ты зьнік, а роспачы – няма.
Туга – яна была заўсёды.
Пачатак дзіўнай асалоды:
Ты зьнік, а роспачы – няма.

Няхай жыцьцё – ня пернік зь мёдам,
Сустрэнемся – скажу сама:
-- Ты зьнік, а роспачы няма,
Туга – яна была заўсёды.

KAMUNIKAT.org

* * *

Тваёй атруты я жадаю
За тое, што яна твая...
Сноў зброя не бярэ мая –
Тваёй атруты я жадаю.

Ізноў пытаюць утрая
За слова горкае "кахаю"...
Тваёй атруты я жадаю,
За тое, што яна твая.

KAMUNIKAT.org

* * *

Не пішы пра мяне нічога,
Бо нічога і не было...
Што звадзіла, што разьвяло –
Не пішы пра мяне нічога.

Ці зрасьцецца тваё крыло,
Ці адолееецца зьнямога?..
Не пішы пра мяне нічога,
Бо нічога і не было.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Каханьне нараджае несвабоду,
А я да волі прывіднай імкнуся.
Я болей да цябе не дакрануся:
Каханьне нараджае несвабоду.

І памяць пра яго я зьнішчыць мусіў,
Што перад тым самота і нягоды...
Каханьне нараджае несвабоду,
А я да волі прывіднай імкнуся.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Я зьведаў смак тваіх вуснаў,
А ўсё астатняе -- дробязь.
Трымцяць чаканьне і боязь:
Я зьведаў смак тваіх вуснаў…

Стварыў дзівосную повязь
Той час, цнатліва-спакусны…
Я зьведаў смак тваіх вуснаў,
А ўсё астатняе -- дробязь.
*   *   *
Каханьне – заўсёды дадатак
Да нейкіх асноўных асноў.
Да грошай, сям'і, атэстата
Каханьне – заўсёды дадатак.

Падлічым здабыткі і страты,
Ды хочацца есьці ізноў.
Каханьне – заўсёды дадатак
Да нейкіх асноўных асноў.

# Рандэль

Пераблытаўшы каханьне з вайной,
Не зьдзіўляйся спусташэньню душы,
Бо паўсюль замест падвойных вяршынь
Атрымаеш празаічны двубой.

Ваяры ж малююць фарбай адной,
Бо усё жыцьцё жывуць на мяжы;
Пераблытаўшы каханьне з вайной,
Не зьдзіўляйся спусташэньню душы.

За любым замком, за кожнай сцяной
Сніць сталёвыя ствалы і нажы.
Заваёўнік... Ты навекі чужы,
Існуеш цяпер маной і віной,
Пераблытаўшы каханьне з вайной.

KAMUNIKAT.org

* * *

Восень страціла золата й ласку,
Ні цяпла, ні сьвятла не ўтрымаць…
Я прыдумваю добрую казку,
Дзе ні цемры, ні здрады няма.
Мой герой з таямніцай на твары
Існаваньня ня мае удзень,
Толькі ў прыцемках спозьненай марай
Ён з’яўляецца й побач ідзе.

І пакуль падаўжаюцца ночы,
І пакуль скарачаюцца дні
Не гані мяне, прывідны хлопчык,
У слату ад сябе не гані.

Мы з табой – не звычайныя людзі,
Ты – з герояў, я – слова на шкле.
Пераводу ў рэальнасьць ня будзе:
Казцы доўга ня жыць пры сьвятле.
І ніхто табе выдаць ня змусіць
Мой адзіны і жорсткі сакрэт:
З сонцам я да рэалій вярнуся,
Нелюбімы рэальным паэт.

І пакуль падаўжаюцца ночы,
І пакуль скарачаюцца дні
Не гані мяне, прывідны хлопчык,
У рэальнасьць мяне не гані.

* * *

Шыбуеш пешшу,
І не шукаеш багоў…
Каханьне першы
З падраных тых ланцугоў.

Яго дзівосы,
Яго асьпект забыцьця
Аськепкам лёсу
Матляюць хвалі жыцьця…

Шыбуеш пешшу,
І не чакаеш выгод.
Складаеш вершы,
Якім тры тысячы год.

Яны маўчалі,
Яны чакалі цябе.
Але начамі
Вы зь імі зноўку ў журбе…

Шыбуеш пешшу,
І не жадаеш сьвятла.
Ты на памежжы,
Ты там заўсёды была.

Няма шкадобы,
Калі абрала сама
Сваёй аздобай
Свабоду слова “зіма”…

kamunikat.org

# Гэроі

Мае рамантычныя, гжэчныя, годныя.
Вы не адшукалі мяне.
Таму маё сэрца ды вочы халодныя,
Іх болей нішто не кране.

Мае рамантычныя, годныя, гжэчныя,
Вы зь іншымі бавіце час.
Вас зноўку казычуць пытаньні адвечныя,
І вабіць далёкі адказ…

Мае рамантычныя, родныя, розныя,
Сустрэчы ня варта чакаць.
Шляхі мяне клічуць занадта сур’ёзныя,
Каб памятаць ранкі пякуча-марозныя,
І нечую фотку ды кветку мімозную
Упарта ля сэрца трымаць

KAMUNIKAT.org

*   *   *

> Я очень люблю случайные встречи
> В эпоху большой нелюбви.
>
> *А.Макарэвіч*

Выпадковай была сустрэча.
Непазбежным было расстаньне…
Дык навошта яно? Пытаньне
Да таго, хто ведае болей.

Я ж ня ведаю. Халадэча --
Быццам вынік таго блуканьня,
Ненадзейных зачараваньняў
Ды бяздарна абраных роляў.

Час прамежкавы – некаханьне.
Час бязьлітасны – халадэча.
Выпадковай была сустрэча.
Непазбежным было расстаньне.

*   *   *

Ужо пражыта і прасьпявана,
Ужо адпіта за вольны пошук,
Рассмакавана, размежавана,
Спакой – прыдбаная мной раскоша.

Ужо ня вабяць пустыя зоркі,
І час дакладна расплянаваны…
Пра што мне весьці цяпер гаворкі
Зь ім, гэтым госцем, амаль нязваным?..

Сяджу, спакойна гляджу у вочы,
Але чаму, па якім законе,
Мяне хвалюе ягоны почырк,
Ягоны голас у тэлефоне?..

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Ты помніш,
Мы баяліся сустрэцца позіркамі,
Вочы ў вочы?..
Ты помніш,
Мы так і не дакрануліся
Адзін да аднаго?..
Але
Ты ведаеш,
І я ведаю,
Што мы ужо зрабілі
Адзін з адным
Усё,
На што здатная
Наша фантазія.

KAMUNIKAT.org

* * *

У мяне пытаньняў няма,
І ніякіх няма надзей.
Праўда ў нечым – заўжды турма,
Ад яе ня вольны нідзе.

Хто з нас хто
У гэтай гульні
Я пакуль ня ведаю, ды
Бачу, хто на якім кані,
І пад што спявае заўжды.

Хто нас будзе заўтра кахаць,
Што пасьля нам будзе балець...
Лёс ня даў жаданага ўзяць
Ці сама не жадаю мець?..

Ай, пустое. Цяпер найперш
Праўда вечнай турмой звініць:
За найлепшы
У свеце
Верш
І вады не дадуць, ані.

KAMUNIKAT.org

* * *

Я хваравбліва пераношу
Твае спакойныя памкненьні.
Мой боль балюча выцінае
Аб межы цэльнасці тваёй…
Карэктнай шчырасьці раскошу
Мне не давесці да збавеньня:
Хірургаў неяк не кранае
Факт напісаньня слоў крывёй.

Юнацтва памятае мары
Пра перарэзаныя вены...
Узрост сярэдні прапануе
Добрасхаваны адзюльтэр, –
Каб не грымелі кулуары,
Каб не цярпела гігіена...
Рацыянальнае пануе
За жалюзі еўракватэр.

Як панна пэўнага узросту
Перабіраю варыянты,
Пасля кантрасна, як падлетак,
Дзялю "люблю" і "не люблю"…
Няпэўны стан, дзе ўсё няпроста,
Я ў ім разумны дылетантам,
І не зраблю ня так, ня гэтак,
Ня ведаю і як зраблю.

*   *   *

Навыдумлялася каханьне,
Якога быць ня можа з намі,
У незакончаным трываньні
Усе магчымыя шляхі...
У прошлым часе паляваньне,
Пачуцьці кшталту хваль-цунамі,
Запал і лёсанараканьні,
І нават горшыя грахі.

Навыдумлялася адносін,
Якіх ня можа быць у сьвеце...
Яны ня тое, каб ідэі,
Ды вельмі блізкія да тых
Шляхоў, якія мкнуць праз восень,
Зіму, вясну й жывуць у леце,
У промнях сонечнай надзеі,
У спадзяваньнях залатых.

Навыдумлялася – і хопіць,
Мая работа – не зламацца,
Тваё пацвердзіць існаваньне,
Цябе для казкі захаваць...
Пішу (хай так ніхто ня робіць),
Каб мне не падпарадкавацца
Неідэальнаму жаданьню
Табе патэлефанаваць.

*   *   *

*"...**Пусть он сыграет надо мной.**"*
*"Машина времени",*
*"Он играет на похоронах и танцах..."*

Попел мой ад  Сафійскай горкі
Аднясе залацісты вецер,
Ён заўсёды мяне любіў...

Калі ты пражывеш болей,
Адшкадуй мне адзін вечар,
Паіграй на маім ветры,
Не зважай, што так стынуць пальцы...

Калі я пражыву болей,
Я наведваць цябе не буду.
Толькі тыя клады люблю я,
Дзе нікога майго няма.

* * *

Мілаю паэмкай мілая паэтка
Выціскае сьлёзкі з тоннай камянюкі:
Трэба ж неяк мужу набываць шкарпэткі,
Раз усе каханкі – злосныя манюкі.

KAMUNIKAT.org

*    *    *

Прызнаньні, наканаваньні…
Што зробіш – Сусьвет такі! –
Пяшчотным салодкім раньнем
Ніколі твайму дыханьню
Маёй не сагрэць шчакі.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Дзень твайго нараджэньня
Як водгульле сьмерці маёй...
Мне чамусьці здаецца –
Яны супадуць неўзабаве.
І чырвоная дата
Чырвонай набракне крывёй,
І такой застанецца;
Ужо ні адняць, ні прыбавіць.

Дзень майго заканчэньня...
Цябе пазавуць ад стала...
Тэлефоны – такая прыдатная
Рэч для навінаў...
Раптам зробіцца цёмна,
Як быццам ня сыпле сьвятла
Крышталёвая люстра...
Пад стольлю – адна павуціна.

Паімчыш на вакзал,
І праб’ешся, і купіш квіток,
І прыедзеш нарэшце
У мой перахрышчаны горад,
Дзе вісіць на сьцяне
У кватэры
Ўчарашні лісток
“25 жніўня”.
Карцінка: караблік і мора.

*   *   *

Мне сьнілася, што ты жабрак, і просіш
У першакурсьніц грошы на гарэлку,
Яны даюць – паперку, дзьве, і тры,
(А за чатыры можна выпіць кавы…)

Пасьля, за кавай, не магла даўмецца –
У нас *былі* і грошы, і віно,
І час, і нат настрой быў адпаведны…
(Так, пра гарэлку – мы яе не п'ем).

Мой сон быў прыкрым і даўгім. Адно што
Усьцешыла – купальскай гэтай ноччу
Пераўтварэньні, пераапрананьні
Звычайныя; то ці не абавязак…
(Але чаму ты ўсё ж стары і брудны,
Даволі брыдкі вулічны жабрак?)

KAMUNIKAT.org

* * *

У прысутнасьці кветкі, якую ты мне падарыў
Выпадкова, відаць, ад штодзённай устойлівай
стомы,
Я зусім не шкадую аб тым, што караблік
прыплыў
У зацішную гавань, якая назвалася домам.

У прысутнасьці кветкі, якая не можа сысьці,
І якая да самага скону маўклівая сведка,
Я клянуся ніколі-ніколі сябе не клясьці
За абраную гавань (прысягі выконваюць рэдка).

Кветка, кветка, бывай! Я табе памахаю рукой,
Я ужо спакавала свае успаміны ды рэчы.
Ты са мной не паедзеш туды, дзе абраны спакой,
Я пакіну цябе аздабляць выпадковыя стрэчы.

* * *

У тым горадзе,
Дзе ніхто ня ведае нас
І таму ня можа закласьці
Нікому з чамусьці зацікаўленых
Нашае сустрэчай асобаў,

У горадзе Б...
(Прабач, гэта адзіны горад,
Дзе я магу ўявіць сабе
Гэтую сустрэчу –
Іншых гарадоў у мяне няма,
А да тваіх мне не даехаць)

Мы сядзім сёньня
У ціхай кавярні
За кубкамі кавы
(Але побач і кілішкі
З іншай вадкасьцю такога ж
Брунатна-цынамонавага колеру),
І ты тлумачыш мне,
Як трэба і што ня трэба
Рабіць у гэтым жыцьці,

Якое такое неспадзявана-
Прадказальнае,
Якое такое няправільнае,
І якое заўсёды мае рацыю,
З якой мая рацыя
Не спраўляецца...

На самой справе ты
Ніколі нічога
Мне не тлумачыш,
І можа таму я сяджу зараз
Зусім у іншым горадзе,
Адна, напрыканцы дня,
І дапальваю будзённую
Банальную цыгарэту
Апошняй надзеі.

KAMUNIKAT.org

* * *

Магія лічбаў і магія сфэр
Зноў сутыкнуліся ў круглае даце...
Нас цяпер позна лавіць на давер,
Мы абазнаныя у сурагаце.

Я не крану адзіноты тваёй,
Ты не чапаеш маёе самоты...
Перамагаем малою крывёй
Восень з яе непатрэбнай лістотай.

Менскую каву і полацкі сум
Без перадумваньня і фіксаваньня
Недзе глыбока пад сэрцам нясу
Простым фэноменам су-існаваньня.

Ды нечакана ў сьляпой барацьбе
З жудасным сном разуменьне прыходзіць:
Я б так хацела паверыць табе,
Можа, адзінаму ў гэтым стагодзьдзі.

*   *   *

Год за годам
Праходзіла побач
З гэтым няўклюдным домам
Па вечна разьбітай вуліцы...

Год за годам
Сьпяшалася на спатканьні
З непатрэбнымі сябрамі
І несапраўднымі ворагамі...

Год за годам
Пад голым небам
Перажывала завеі і сьпёку,
Ня ведаючы,
Што ў гэтым доме
Усе гэтыя гады
Мяне чакаў
Ты.

KAMUNIKAT.org

* * *

Я ня выдам цябе
Ні сябрам, ні багам,
Ні у слоўнай гульні,
Ні на споведзі шчырай.
        Акалічнасьцей зьбег
        І старая нуда
        Перасьніліся ў дні
        Успамінаў пра вырай.

Я ня выдам цябе
Ані рухам, ні сном,
Не падоўжу размоў
І усьмешку стрымаю.
        Аднастайны напеў
        Завірух за вакном
        Халадэчы нямой
        Адзіноты спрыяе...

Я ня выдам цябе,
Бо баюся сама
Зноўку стаць нічыёй
Паміж сном і сьвітаньнем,
        Замінуць варажбе,
        Што стварыла зіма,
        Цёплай верай сваёй
        У тваё існаваньне.

# Ноч у Вільні

Я пішу табе
На паперы гатэля “Congress”,
Седзячы самотна
У гасьцёўні нумара на дзьве асобы,
Куды я так і не запрасіла нікога
Пагасьцяваць на ноч,
(Хоць вымалёўваліся
Вельмі прывабныя прапановы),
І шкадую пра тое,
Што цябе няма побач,
Каб падзяліць са мной
Цыгарэту “Parliament”,
Келіх ночы,
Белыя прасьціны
Двухспальнага ложка,
Свабоду,
Вільню.

KAMUNIKAT.org

## Пацеркі

Перабіраць
Дарагія ўспаміны
Як пацеркі…
Сустрэча,
Сустрэча,
Сустрэча
У Менску,
У Полацку,
У …
Па дарозе
Ад раніцы да вечара,
Ад фантазіі да рэаліі,
Ад маладога кіпрскага віна
Да старога рыжскага бальзаму…
І як бы далёка
Не занёс цябе лёс,
Са мною
Мае каралі.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

На тэрмомэтры старым мінусы,
А гадзіньнік мой наперад імкне...
Я вясной люблю прысьніць галасы
Тых, што некалі кахалі мяне.

Будзень, клопат як заўсёды ўвесь мой,
Дзень самотны падрыхтуе да сну...
Ды пакуль мае ўспаміны са мной,
Не адна я сустракаю вясну.

З кожным годам сны мне бачыць лягчэй,
Толькі ты у сон мой не завітаў.
Ці таму, што не мінулы яшчэ,
Ці таму, што насамрэч не кахаў.

KAMUNIKAT.org

* * *

Там, за вокнамі, -- дождж…
Там, за вокнамі, -- сон.
Там, за вокнамі, ноч
Без маланак і зор.
        Я сяджу ля вакна,
        Гэтай ночы крысо
        Ахінае мяне,
        Быццам похвы лязо…

Ды мяне не схаваць,
Ды мяне не спыніць,
Да мяне не дайсьці,
Ля мяне не сканаць.
        Адзінокая здань,
        Ты мяне будзеш сьніць,
        І імя, як заклён,
        У трызьненьнях шаптаць…

А за тое, што ты
Даў імя мне - зіма,
Даравала даўно,
Без абвесткі прычын.
        У апошнюю ноч
        Я з'яўлюся сама,
        І прысутнасьць сваю
        Не азмрочу нічым.

*   *   *

О, як нясьцерпна і прагна
Свабоду сваю люблю!
Яна - і бездань, і багна,
І небам робіць зямлю.

Яна - ня тая каханка,
Каб штосьці прабачыць мне,
І ейная калыханка
На яве са мной і ў сьне.

І толькі калі пры стрэчы
Я дотык адчую твой,
На міг ці на гэты вечар
Я веру табе, ня ёй.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Жыць як прыйшлося, не на свой матыў,
Жыць у палоне сноў і абавязкаў.
Пакутліва трываць імператыў
Звычайнага жыцця з чыёйсьці ласкі…

Яшчэ трымаць сябе у кулаку,
Яшчэ хоць зрэдку спрабаваць узьняцца,
І зноўку курчыцца ў дэпрэсьняку,
Бо ты мяне не прыгадаў ў нататцы.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Калі жанчына разьнімае ногі,
Абхоплівае талію каханка,
Яго сьцябло яе знаходзіць кветку,
Пухнатую ці голеную гладка,
Што думае яна
У гэты момант?..
        “Нішто памеры”,
                “Прыкупіць бы бульбы”,
        “Надвор’е - клас,
                я файна загарэла”,
        “Наступны раз
                не забываць пракладку”,
        “Я сыну
                не сказала пра капусту”,
        “Хачу на мора”,
                “Хоць бы заплацілі”…
Ці думае яна:
        “Ах, ён кахае,
                мяне кахае,
        Я яго хачу,
                хадзі хутчэй,
        Хутчэй хадзі сюды”…
Я думала пра ўсё гэта з усімі.
Я ні пра што ня думаю з табой.

* * *

Пасьля кожнага разьвітаньня
Я хачу цябе яшчэ болей.
Нам ня будзе з табой даволі
Тых кароткіх гадзін спатканьня.

Ні на што не мяняю волі,
Толькі зноўку згадала зраньня:
Пасьля кожнага разьвітаньня
Я хачу цябе яшчэ болей.

KAMUNIKAT.org

* * *

Аднойчы вечарам,
Калі вакол было многа людзей
І мала шчырасьці,
Калі на стале было многа віна
І мала радасьці ад яго,
Мне нясьцерпна захацелася
Выказаць свой сум па табе,
І я напісала табе:
"I love you"
(Мабільнік...
Новыя магчымасьці зносін...
Прагрэс?..)
Цяпер гадаю -
Што я сказала табе -
"Люблю цябе" ці "Кахаю"?

* * *

Тая чорная бранзалетка,
Выпадковая непазьбежнасьць,
Я надзела яе, бо восень
Стала шэраю з залатой.
Лёс падкінуў маю манэтку,
Перавызначыў прыналежнасьць,
У сцэнар асабістых зносін
Прыцягнуў падарунак свой.

Калі нават ня будзе выйсьця,
Акрамя як у ноч і замець,
На руцэ маёй чорнай кветкай
Расьцьвіце прызначэньня збой.
Лёс гуляе апалым лісьцем...
Сон міне - застанецца памяць
Тою чорнаю бранзалеткай,
Не падоранай мне табой.

*   *   *

Кожнага разу я мераю твой пярсьцёнак,
Бы прымяраю лёс -- дасягненьні й страты.
Мы спачуваць, даравацьі прабачыць рады --
Кожнага разу я мераю твой пярсьцёнак.

Кожнага разу лёсу паказваць дулю
Мне удаецца, ён гэта зноў прабачыць,
Бо паважае тых, што усё іначаць,
Кожнага разу лёсу пакажуць дулю.

Я не прарок, я паэт, хоць і кажуць -- добры,
Ды галавою аб цьвёрдую сьценку біты.
Не пераказваю -- уладна ствараю міты…
Я не прарок, я паэт, хоць і кажуць -- добры.

Цьвёрдым сумленьнем, тугою, радкамі чыстымі,
Пераўвасоблю, перапішу нязьдзейснае.
А як надарыцца лёс падмануць увесну мне,
Зноўку пярсьцёнак надзену і дулю выстаўлю.

*   *   *

Дзень добры
для вершаў,
напісаных у вулічнай кавярні…

Дзень добры
для нетаропкага шпацыру па горадзе,
дзе я магу насіць твой пярсьцёнак
(часу заўсёды
то цягуча многа,
то катастрафічна мала)…

Дзень добры
для нетэлефанаваньня сябрам
(зробім выгляд, што раптам
забыліся усе тэлефоны)…

Дзень добры,
нягледзячы на
залітыя півам джынсы
(дурны парыў ветру
плюс уласная няўклюднасьць)…

Дзень добры,
горад,
дзе я магу сёньня
думаць пра цябе
вершамі.

KAMUNIKAT.org

* * *

З высокай полацкай музэйнай вежы
Мне напляваць, як гэта назавуць.
Табе і мне адносіны належаць…
Што ж, абавязкаў вызначаны межы
І іх абодвум выканаць належыць,
Але яны пачуцьцяў не скуюць.

Таму, прабач, я летуценна мрою,
Што некалі, няхай праз колькі год,
Прачнемся побач ў доме над Дзьвіною
Пад палянэз вясновага настрою…
Асьвеньціць неба над табой і мною
Буслоў спрадвечных роўны карагод.

KAMUNIKAT.org

* * *

Прэснага будню багна –
Солі няма у печыве.
Так невыносна болей –
Я пазваню сама...
І вось люблю цябе прагна
Гэтым салёным вечарам...
Можа, таму і болю
Ў вачах у мяне няма.

KAMUNIKAT.org

* * *

Я так сумую па табе,
Што вымавіць ня маю сілы
Нічога, акрамя: “Мой мілы,
Я так сумую па табе”.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Паўднёвай прыморскай ноччу,
калі цыкады
перакрываюць шум прыбою,
а маладзік перамірґваецца з зоркамі,
калі вецер
пакідае на вуснах
салёную горыч,
а чырвонае віно
мае салодкі прысмак
даўніх пацалункаў,
калі прадчуваньне
заўтрашняга дажджу
прыдае паху падвялым ружам,
а недзе на верандзе
суседняй кавярні
ціха дагрызае саляту трусік-альбінос,
хочацца нетаропка кахацца,
зьвяраючы рытм з цыкадамі і прыбоем,
лавіць адну за адной
хвалі чаканай асалоды,
задыхнуцца ад апошняй,
сумеснай,
і адразу заснуць на тваім плячы,
плюнуўшы на ўсе гігіенічныя працэдуры.

* * *

Багоўка, багоўка…
Хто засадзіў цябе
паміж шыбамі
наглуха забітага вакна
у напаўзакінутым пансыянаце
на беразе шумлівага мора?

Які дзень назіраю
бясконцы шпацыр твой
 і ня маю мажлівасьці
адпусьціць цябе
для вольнага палёту.

У небе лётаюць птушкі і самалёты,
і тэарэтычна магла б лётаць і ты,
няхай бы твой палёт быў і
не такім відовішчным.

Часам
я пачуваюся
такою багоўкаю,
што бясконца сноўдаецца
паміж шклом абавязку
і шклом пачуцьця.

*   *   *

Будзем цалавацца
на кожным
віленскім перакрыжаваньні,
а час ад часу
і проста пасярод
брукаваных вулачак,
зьдзіўляючы эўрапейскіх турыстаў,
якіх абазнаныя турмэнэджары
папярэджваюць перад паездкай,
што выказваць пачуцьці
ў краінах былога саўка
трэба вельмі стрымана.

Будзем цалавацца,
седзячы бок а бок
за кілішкам чырвонага
пад палатнянымі дахамі
вынесеных на ходнікі столікаў,
выклікаючы ўсьмешкі на вуснах
маладзенькіх хайрастых парачак;
зрэшты, хай зайздросьцяць
і надалей.

Будзем цалавацца
пад маім маленькім парасонам
пасярод раптоўнай залевы
і прыціскацца адно да аднаго
зусім не таму,
што страшна падмачыць
твой турэцкі швэдар
ці маю італьянскую скуранку.

Будзем цалавацца
і зусім забудземся
на ўсіх выбітных дзеячоў
беларускага адраджэньня,
якія крочылі па гэтых вулачках да нас,
і якія таксама
недзе тут,
напэўна,
цалаваліся з кімсьці,
чые імёны мы не прачытаем у архівах,
а толькі сасьнім.

Будзем цалавацца
і потым
штовечар
узгадваць гэтыя пацалункі,
калі вернемся зь Вільні
кожны ў свой горад,
на сваю вуліцу,
да сваёй несвабоды.

KAMUNIKAT.org